Modern History Archives
Archives ... Historyi
Fond F1/22 sprava 3 42

# ЗВАРОТ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ ДА БЕЛАРУСКАЕ ДЫЯСПАРЫ

BPS

wy0okl.net

Лепшыя прадстаўнікі нашае эміграцыі наведалі шматпакутную, паняволеную Беларускую Зямлю. Гэтыя людзі прыехалі ў цяжкі для Айчыны час. На Беларусі пануе расейскі мафіёзны стаўленік...

Суайчыньнікі! Беларускія нацыянал-патрыёты з права-кансэрватыўнай **Беларускай партыі Свабоды (БПС)** нагадваюць Вам, што пытаньне захаваньня беларускае прысутнасьці ў сьвеце вырашаецца не па-за межамі Бацькаўшчыны, а тут, на Беларусі. Тут лёс Беларушчыны й беларуса. Тут беларуская рэчаіснасьць і адсюль пачынаецца **Беларускі шлях**! Гэта шлях барацьбы, якім лепшыя людзі Нацыі прыйдуць да Перамогі! Беларусь пад акупацыяй! Векавыя кайданы рабства йшчэ ня скінутыя!

Якая мэта ў нашых шаноўных эмігрантаў? Падштурхнуць беларускую эліту да актыўнага змаганьня за незалежнасьць, ці гэта толькі "спартовы інтэрас" паназіраць ублізку, што робіцца на Радзіме?

Беларускія нацыяналісты зьвяртаюцца да розуму й сэрцаў сыноў беларускае зямлі, раскіданых па сьвеце.

Спадарства! Хто збаяўся давесьці народную (вызвольную) рэвалюцыю 1991 г. да канца? Хто недаравальна прайграў прэзыдэнцкія выбары? Хто ў бясконцых сварках, інтрыгах, узаемнай хлусьні дый недаверы дазволіў прыйсьці да ўлады расейскаму агенту? Хто саступіў Лукашэнку абодва рэфэрэндумы? Адказ просты па банальнасьці — памяркоўныя дэмакраты. На [illegible]нал-дэмакратах (БНФ), сацыял-дэмакратах і лібералах (АГП) кладзецца цяжар адказнасьці за паразы ў вызначальны для Беларусі час. Дэмакраты йшчэ й зараз ілгуць, апраўдваючы свае промахі надзвычайным геніем расейскага халуя. Ілгуць яны й у адрыс новага лягеру беларускіх нацыяналістаў, што гартуецца ў зьняволенай Бацькаўшчыне. Да яго належаць найперш ідэйная БПС, што мела перамогу на парляманцкіх выбарох ва ўмовах рэпрэсыяў, а таксама "Белы легіён".

vytoki.net

Мы ня прыймаем "дэмакратычнае" дэмагогіі, мы **дзейнічаем**. Таму мы, нацыяналісты, верым у зацікаўленасьць эміграцыі падтрымаць гэтую дзейнасьць.

Нацыяналістычны лягер яшчэ ў разьвіцьцёвым стане. Замаруджваньне гэтага разьвіцьця ў значнай ступені зьвязанае з фінансавай дый інфармацыйнай блакадай з боку дэмакратаў. Мы паважаем пачуцьці нашых землякоў, але за сродкі, што пайшлі на сёньняшнюю імпрэзу, мы падрыхтавалі б дзесятак хлапцоў дзеля запраўднае барацьбы...

Прыйдзе час, і ў сваю апошнюю хвіліну мы запытаем сябе: "Ці ўсе я зрабіў дзеля свае Бацькаўшчыны? Нягледзячы на мае былыя заслугі, чаму я тады не зрабіў таго, што мог?!"

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond ............sprava..........

**Ты йшчэ можаш дапамагчы вызваленьню Айчыны!**

*Кантактовыя тэлефоны Беларускае партыі Свабоды ў Менску: (017) 261-3837, (017) 262-2261*

Друкарня імя Кастуся Астроскага

vytoki.net